# ГАЗЕТА «ПЕРАПЫНАК»

**ВУЧЭННЕ — ТОЛЬКІ СВЯТЛО, ПА НАРОДНАЙ ПРЫМАЎЦЫ, — ЯНО ТАКСАМА І СВАБОДА. НІШТО ТАК НЕ ВЫЗВАЛЯЕ ЧАЛАВЕКА, ЯК ВЕДЫ… *І. ТУРГЕНЕЎ***




## 15 САКАВІКА – ДЗЕНЬ КАНСТЫТУЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

## КАРАБЕЛЬ "САЮЗ МС-25" З КАСМАНАЎТАМ З БЕЛАРУСІ ВЫЙШАЎ НА РАЗЛІКОВУЮ АРБІТУ



**23 сакавіка Марына Васілеўская стала першай беларускай-касманаўтам, а таксама першым касманаўтам у суверэннай гісторыі краіны.**




**Міжнародны жаночы дзень** – гэта як раз тое самае свята, калі мы можам падзякаваць сваім мамам за ўсё добрае, што яны зрабілі для нас, выказаўшы сваю любоў і клопат.

## Хатынь - 81 год трагедыі



*У ГЭТЫМ ВЫПУСКУ*

| | | |
|---|---|---|
| ДЗЕНЬ КАНСТЫТУЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ | 22 САКАВІКА – ДЗЕНЬ ПАМЯЦІ АХВЯР ХАТЫНІ | ПЕРШАЯ БЕЛАРУСКА Ў КОСМАСЕ |

ГАЗЕТА «ПЕРАПЫНАК»

# НАВІНЫ ДЗІЦЯЧАГА САДА

**ЛЕАНЕЦ АНАСТАСІЯ,**

**8 КЛАС**

**Міжнародны жаночы дзень** – гэта як раз тое самае свята, калі мы можам падзякаваць сваім мамам за ўсё добрае, што яны зрабілі для нас, выказаўшы сваю любоў і клопат.

Напярэдадні свята выхаванцы дзіцячага сада падрыхтавалі канцэртную праграму, прысвечаную жаночаму дню 8 сакавіка.



## Канцэртная праграма “Для любай матулі”

Віншаванні, песні, танцы і вершы гучалі для любімых матуль і бабуль. Спадзяемся, што дадзеныя мерапрыемствы прыўнеслі ў жыццё нашага дзіцячага сада атмасферу вясновай радасці і шчасця.

*Падзякаваць трэба той матчынай песні,*
*З якой пачынаецца наша жыццё,*
*Жыццё роднай мовы ў маленечкім сэрцы,*
*Што стала вялікім, як свет, пачуццём.*
*Алена Лянок*








ГАЗЕТА «ПЕРАПЫНАК»




## Адзіны ўрок і ўрачыстая лінейка, прысвечаныя Дню Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь

**ГЕРМАНОВІЧ КСЕНІЯ,**

**8 КЛАС**

Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь з'яўляецца асноўным законам дзяржавы, які мае вышэйшую юрыдычную сілу і прамое дзеянне на ўсёй тэрыторыі краіны.

Урачыстая лінейка адкрылася з агучвання слоў, якімі пачынаецца Канстытуцыя.

Далей рабяты дружна паўдзельнічалі ў флэшмобе "Праспяваем гімн разам".

І ў завяршэнні лінейкі прайшла цырымонія развітання з піянерскім гальштукам і ўручэнне членскіх білетаў Беларускага рэспубліканскага саюза моладзі для навучэнцаў, якія дасягнулі ўзросту 14 гадоў. Выхаванцы дзіцячага садка ўручылі ім кнігу "Я – грамадзянін Рэспублікі Беларусь".

На адзіных уроках дзеці даведаліся аб стварэнні, прыняцці і ўнясенні змяненняў у Канстытуцыю РБ, прагледзелі відэаролік, створаны Беларускім дзяржаўным архівам кінафотафонадакументаў.








01.04.2024 / / ПАНЯДЗЕЛАК / / 7 ВЫПУСК

ГАЗЕТА «ПЕРАПЫНАК»




## *22 САКАВІКА – ДЗЕНЬ ПАМЯЦІ АХВЯР ХАТЫНСКАЙ ТРАГЕДЫІ*

**149 чалавек, з іх 75-дзеці ... 81 год таму жыхары вёскі Хатынь былі спалены жыўцом карным атрадам.**

Раніцай 22 сакавіка нямецкі батальён на чале з капітанам паліцыі Хансам Вёльке – першым алімпійскім чэмпіёнам з Германіі – ехаў ліквідаваць пашкоджанні сувязі. Па шляху калона трапіла ў партызанскую засаду, у перастрэлцы загінуў Вёльке. Раз'юшаныя карнікі палічылі, што 26 дзяўчат, якія працавалі недалёка на лесанарыхтоўцы, датычныя да засады. Іх расстралялі на месцы.

Далей гітлераўцы высветлілі, што атрад партызан незадоўга да гэтага начаваў у Хатыні. Карны батальён вырашыў паказаць, што бывае за дапамогу партызанам. Усіх жыхароў замкнулі ў хляве і падпалілі.









### Адзіны ўрок, прысвечаны гадавіне трагедыі вёскі Хатынь

З мэтай паглыблення ведаў вучняў аб гістарычным мінулым беларускага народа, трагічных падзеях у Хатыні, фактах генацыду беларускага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны, фарміравання адмоўнага стаўлення да гвалту ў нашай школе 22 сакавіка 2024 года прайшоў адзіны ўрок, прысвечаны гадавіне трагедыі ў вёсцы Хатынь.

**На ўроках дзеці ўспомнілі даты гісторыі Хатыні, паразважалі аб наступствах злачынства нацыстаў над лёсамі жыхароў Беларусі, а таксама правялі хвіліну маўчання ў памяць аб ахвярах вайны.**



ГАЗЕТА «ПЕРАПЫНАК»



## КАРАБЕЛЬ "САЮЗ МС-25" З КАСМАНАЎТАМ З БЕЛАРУСІ ВЫЙШАЎ НА РАЗЛІКОВУЮ АРБІТУ

# Марына Васілеўская – першая жанчына-касманаўт Беларусі

**САВЕНОК ГАННА, 8 КЛАС**

*У руху Свет заўжды бясконцым.*
*Планеты розныя і Сонца,*
*Бяскрайні космас – ты і я…*
*Хоць сцежка ў кожнага свая,*
*Ідзём вядомы адной мэтай,*
*Ёй падуладны ўсе паэты:*
*Парыў душы сваёй адкрыць,*
*Яго з Сусветам спалучыць…*

## Паехалі! Першая беларуска ў космасе!

**23 сакавіка Марына Васілеўская стала першай беларускай-касманаўтам, а таксама першым касманаўтам у суверэннай гісторыі краіны.**

Камандзірам карабля стаў Алег Навіцкі, а ў якасці бортінжынера выступіў астранаўт NASA Трэйсі Колдвел-Дайсан.

Алег і Марына правядуць на арбіце 12 сутак і вернуцца дадому 2 красавіка на караблі «Саюз МС-24» разам з Ларал Охарай. Трэйсі Дайсан будзе працаваць у космасе 186 сутак і прызямліцца 23 верасня на караблі «Саюз МС-25» разам з Алегам Кананенка і Мікалаем Чубам.






01.04.2024 / / ПАНЯДЗЕЛАК / / 7 ВЫПУСК

ГАЗЕТА «ПЕРАПЫНАК»

Падключыць СМС-апавяшчэнне аб тратах дзіцяці





Абмежаваць выдаткі на пакупкі (асобна - на інтэрнэт-крамы і на гульні)









# ЯК ЗАСЦЕРАГЧЫ "ДЗІЦЯЧУЮ" БАНКАЎСКУЮ КАРТКУ





Абмежаваць зняцце наяўных



Расказаць аб ашуканцах, забараніць паведамляць нумар карткі і коды